# Развіццё прамысловасці Беларусі ў 1953–1964 гадах: тэндэнцыі і паказчыкі

УДК [94+67/68](476)«1953/1964»



**Мікалай НЕСЦЯРОВІЧ, кандыдат гістарычных навук**

**Мікалай НЕСЦЯРОВІЧ. Развіццё прамысловасці Беларусі ў 1953–1964 гадах: тэндэнцыі і паказчыкі.** У артыкуле разглядаецца развіццё прамысловасці Беларускай ССР у гады хрушчоўскай адлігі. Даецца ацэнка, як уплывала на яго рэформа кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, распачатая ў 1957 годзе. Аналізуюцца асноўныя тэндэнцыі і паказчыкі прамысловага развіцця рэспублікі, у тым ліку ў параўнанні з дасягненнямі ў гэтай галіне саюзных рэспублік і СССР у цэлым, а таксама найбольш развітых капіталістычных краін.
**Ключавыя словы:** прамысловасць, прамысловае развіццё, тэмпы росту, рэформа кіравання прамысловасцю, прадукцыйнасць працы, фондааддача, вытворчасць сродкаў вытворчасці.

**Mikalai NESTSIAROVICH. Development of the industry of Belarus in 1953–1964: trends and indicators.** The article examines the development of the industry of the Byelorussian SSR during the years of Khrushchev's 'thaw'. The author gives his assessment of the impact of the industrial reorganization reform launched in 1957 on the development of the industry. The article shows the main trends and indicators of the industrial development of the republic. The author compares the industrial development of the Byelorrusian SSR against other USSR republics and the USSR as a whole, and also the most developed capitalist countries.
**Keywords:** industry, industrial development, growth rates, industrial management reform, labor productivity, fixed-asset turnover, production of means of production.

У 1957 годзе ў СССР пачалася ініцыяваная М. Хрушчовым рэформа кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, якая ў выніку распаўсюдзілася на ўсю народную гаспадарку краіны. Яна прадугледжвала значную дэцэнтралізацыю гэтага кіравання, набліжэнне яго да прадпрыемстваў і будоўляў, г. зн. пераход ад галіновага да пераважна тэрытарыяльнага прынцыпу кіравання. Пазітыўны ўплыў рэформы ў першыя гады яе праўядзення ў далейшым сышоў на нішто, і ў 1965 годзе савецкая эканоміка вярнулася да традыцыйнага галіновага прынцыпу кіравання.

## ПРА АЎТАРА

НЕСЦЯРОВІЧ Мікалай Барысавіч.

Нарадзіўся ў 1959 годзе ў г. Чаромхаве Іркуцкай вобласці Расійскай Федэрацыі. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1981), аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР (1989).

У 1981 годзе працаваў настаўнікам гісторыі ў Бор-Дубянецкай васьмігадовай школе Столінскага раёна, потым выкладчыкам гісторыі, грамадазнаўства і савецкага права Столінскага сельскагаспадарчага тэхнікума. З 1989 года – у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі: малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, навуковым супрацоўнікам групы па вывучэнню сталінскіх рэпрэсій, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, аддзела навейшай гісторыі. З 2018 года – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук (1990).

Аўтар больш чым 140 навуковых і навукова-папулярных публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: пытанні эканамічнай гісторыі Беларусі, развіцця яе нацыянальнай дзяржаўнасці ў савецкі і постсавецкі час.

Тым не менш на першым этапе (да пачатку 1960-х гадоў) яна аказала пазітыўны ўплыў на паказчыкі развіцця народнай гаспадаркі СССР. Савецкая эканамічная сістэма ў гэты перыяд дэманстравала вельмі хуткі рост. Тэмпы росту прамысловай вытворчасці СССР у 1953–1960 гадах прыкметна перавышалі тэмпы росту прамысловасці найбольш развітых капіталістычных краін: ЗША, Англіі, Францыі, ФРГ і Італіі *[1, с. 174; 2, с. 18; 3, с. 121–122; 4, с. 16]*. Разрыў ва ўзроўнях прамысловага развіцця СССР і самай эканамічна моцнай капіталістычнай краінай – ЗША – значна скараціўся. Калі ў 1950 годзе прадукцыя савецкай прамысловасці складала менш за 30 % ад прамысловай вытворчасці ЗША, у тым ліку менш за 25 % у разліку на душу насельніцтва, то ў 1960 годзе – ужо каля 60 % па валавым аб'ёме і некалькі болей за 50 % па душавым *[5, с. 139]*.

Дастаткова паспяхова развівалася і прамысловасць БССР. Сярэднегадавыя тэмпы росту прадукцыі беларускай прамысловасці былі нават вышэйшыя, чым у цэлым па СССР. У выніку ў 1960 годзе агульны аб'ём прамысловай прадукцыі ў рэспубліцы ў параўнанні з 1950 годам павялічыўся ў 3,7 раза (большы рост быў толькі ў Літоўскай і Малдаўскай ССР) *[6, с. 463; 7, с. 24, 31]* і ў 2,7 раза ў параўнанні з 1952 годам *[8, с. 12]*. Ужо ў 1958 годзе на душу насельніцтва БССР выраблялa больш, чым у цэлым па СССР: паперы, веласіпедаў – у 4 разы, торфу, станкоў металарэзных, трактароў – амаль у 3 разы. Значна вышэй, чым у астатніх рэспубліках, быў аб'ём вытворчасці на душу насельніцтва шкла, цэглы, спірту-сырцу, абутку скуранога, панчошна-шкарпэтачных вырабаў, ільняных тканін, штучнага валакна, бялізнавага і верхняга трыкатажу, аўтамабіляў і іншых тавараў. У 1958 годзе БССР выйшла на другое месца ў краіне па здабычы торфу, вытворчасці фанеры, ільновалакна, ільняных тканін, на трэцяе – па выпуску грузавых аўтамашын, трактароў, металарэзных станкоў, цэменту. У разліку на душу насельніцтва рэспубліка выраблялa металарэзных станкоў больш, чым Францыя і Японія, трактароў – больш, чым Англія, Францыя і Італія, матацыклаў – больш, чым Англія, веласіпедаў – больш, чым ФРГ, Англія і Італія. Па вытворчасці масла на душу насельніцтва БССР апярэдзіла Англію, Італію, скуранога абутку – ФРГ, Данію, Нарвегію, Фінляндыю, Францыю і Швецыю *[9, с. 382–383]*.

1950-я гады хрушчоўскай адлігі, калі ў Савецкім Саюзе выконваліся пяты (1951–1955) і шосты (1955–1960) пяцігадовыя планы развіцця народнай гаспадаркі (у 1959 годзе шосты пяцігадовы план быў заменены на сямігадовы – 1959–1965), на думку многіх эканамістаў, сталі своеасаблівым залатым векам савецкай адміністрацыйна-каманднай эканомікі, эфектыўнасць якой была максімальнай, а тармозячы ўплыў на эканамічны рост – мінімальным *[10, с. 175; 11, с. 309]*. Гэта было дасягнута ў асноўным за кошт павелічэння экстэнсіўных фактараў развіцця. Эканоміка абапіралася на ўкладанне ў вытворчасць усё большай колькасці дадатковых рэсурсаў (як матэрыяльных, так і людскіх), а не на інтэнсіўныя метады і фактары павелічэння аб'ёмаў прадукцыі – павышэнне прадукцыйнасці і фондаўзброенасці працы, аддачы асноўных вытворчых фондаў і зніжэнне матэрыялаёмістасці вытворчасці.

У 1951–1958 гады сярэднія штогадовыя капітальныя ўкладанні ў прамысловасць БССР склалі 97 млн рублёў, удвая перавысіўшы сярэднегадавы ўзровень капітальных укладанняў у прамысловасць у гады чацвёртай пяцігодкі і ў 4,6 раза – укладанні ў даваенным 1940 годзе. За 1951–1958 гады ва ўсе галіны эканомікі рэспублікі было ўкладзена 2,5 млрд рублёў – у 1,5 раза больш, чым за ўсю яе савецкую гісторыю *[9, с. 370]*. У 1951–1963 гады на экстэнсіўныя фактары прыпадала 68,2 % прыросту канчатковага прадукту эканомікі СССР *[12, с. 305]*.

У 1950-я гады прыцягнутых дадатковых рэсурсаў аказалася дастаткова для забеспячэння высокіх тэмпаў эканамічнага росту. У наступныя гады аб'ёмы рэсурсаў экстэнсіўнага павелічэння вытворчасці таксама вельмі значныя. Дарэчы, у СССР быў адзін з самых высокіх узроўняў інвестыцый у свеце, а ў прамысловасць БССР за 1961–1965 гады ўкладзена сродкаў больш, чым за ўвесь папярэдні перыяд з 1919 па 1960 год, пры гэтым тэмпы росту капітальных укладанняў у прамысловасць рэспублікі былі значна вышэй за сярэднія паказчыкі па краіне *[13, с. 21; 14, с. 137–138]*.

Аднак, нягледзячы на гэта, тэмпы росту савецкай каманднай эканомікі пачалі зніжацца. Ужо ў 1960–1961 гады яны аказаліся меншымі, чым сярэднегадавыя тэмпы росту нацыянальнага даходу і прамысловай прадукцыі,

намечаныя ў праграме КПСС і сямігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР *[15, с. 6]*. За 1961–1965 гады прырост нацыянальнага даходу СССР (у супастаўных цэнах) склаў 38 супраць 54 % за 1956–1960 гады *[16, с. 186]*. Сярэднегадавыя тэмпы росту прадукцыі прамысловасці краіны адпаведна знізіліся з 10,4 да 8,6 % *[17, с. 37]*. Сярэднегадавыя тэмпы росту прамысловай вытворчасці ў БССР, якія па-ранейшаму былі вышэйшыя, чым у цэлым па СССР, упалі з 12,4 % у 1956–1960 гады да 10,4 % у 1961–1965 гады *[7, с. 31]*.

Рэзка пагоршыліся якасныя паказчыкі работы прамысловасці, у прыватнасці паказчыкі выкарыстання асноўных фондаў. За чатыры гады сямігодкі яны знізіліся ў цэлым па народнай гаспадарцы СССР на 9 %. Калі ў 1953 годзе на адзін рубель асноўных фондаў было выраблена прадукцыі на 1 руб. 88 кап., то ў 1963 годзе – на 1 руб. 72 кап. *[18, с. 105]*. Зменшыўся выпуск прадукцыі на адзін рубель прамыслова-вытворчых асноўных фондаў і ў беларускай прамысловасці, у якой фондааддача за сямігодку ўпала на 23 % *[9, с. 448; 14, с. 121]*.

Яшчэ больш павялічылася дыспрапорцыя развіцця прамысловай вытворчасці па групах «А» і «Б». У цэлым па савецкай прамысловасці дыспрапорцыя дасягнула рэкорднага ўзроўню ў 1963 годзе, калі тэмпы росту групы «А» (10 %) удвая перавысілі тэмпы росту групы «Б» (5 %) *[18, с. 105]*, а ў прамысловасці БССР яна была яшчэ большай – тэмпы росту склалі адпаведна 13 і 4 % *[7, с. 25]*. З прычыны гэтага суадносіны ўзроўняў вытворчасці СССР і ЗША ў 1963 годзе складалі: па ўсёй прамысловасці 65 % (ЗША – 100 %), але ў тым ліку па групе «Б» – у СССР усяго толькі 45 %. Такім чынам, па групе «Б» Савецкі Саюз адставаў ад ЗША больш чым у два разы, і, па падліках Інстытута эканомікі Акадэміі навук СССР, каб дагнаць іх, Савецкаму Саюзу патрабавалася не меней за пятнаццаць гадоў *[18, с. 105]*.

У БССР за гады сямігодкі вытворчасць сродкаў вытворчасці ўзрасла на 136 %, а прадметаў спажывання – на 78. Выпрацоўка прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай прамысловасці за гэты час павялічылася ў 3,4 раза, тады як выпуск прадукцыі ўсёй харчовай прамысловасці рэспублікі вырас толькі ў 1,8 раза, лёгкай – у 1,6 раза *[9, с. 439–440, 452; 19, с. 29]*.

У гады сямігодкі ў Беларусі рост вытворчасці сродкаў вытворчасці апярэджваў рост вытворчасці прадметаў народнага спажывання нават у большых памерах, чым гэта намячалася ў сямігадовым плане. Было не выканана заданне сямігодкі па вытворчасці шэрагу важных прамысловых вырабаў – жорсткіх і верхніх скураных тавараў, ільновалакна, гадзіннікаў, фотаапаратаў (у 1965 годзе было выраблена 83,4 тыс. штук супраць 297,2 тыс. штук у 1960 годзе *[19, с. 29]*), па улову рыбы, выпуску хімічных валокнаў і іншых тавараў *[9, с. 448]*.

Разлікі М. Хрушчова на тое, што перабудова кіравання прамысловасцю зблізіць тэмпы развіцця прамысловасці групы «А» і групы «Б», не апраўдаліся. Наадварот, узмацніліся дыспрапорцыі, пагоршылася становішча.

З 1960 годзе ў прамысловасці СССР стала выяўляцца і такая негатыўная тэндэнцыя, як паступовае зніжэнне тэмпаў росту прадукцыйнасці працы. Калі ў 1959 годзе рост складаў 7,4 %, то ў 1960-м – 5,4, а ў 1961-м – 4,4 *[17, с. 44]*. У прамысловасці БССР тэмпы росту прадукцыйнасці працы ўпалі з 8 % у 1960 годзе да 4 % у 1961 годзе *[7, с. 63]*.

Пагаршэнне стану спраў у прамысловасці адбывалася на фоне далейшага ўзмацнення камандных метадаў кіравання эканомікай і ўсімі сферамі жыцця грамадства. На мяжы 1950–1960-х гадоў у партыйна-дзяржаўнай эліты, якая імкнулася да кансервацыі існуючых асноў жыццядзейнасці савецкага грамадства, узнікла імкненне «адзяржавіць» усё і ўся, увязваць любыя дасягненні з адміністрацыйнымі метадамі кіравання як «найлепшымі». Паколькі дзяржаўная ўласнасць была абвешчана асноўнай і найвышэйшай формай, адбывалася яе абсалютызацыя: да сярэдзіны 1960-х гадоў прамысловая кааперацыя была поўнасцю ліквідавана, нарастаў працэс пераўтварэння калгасаў у саўгасы, што пашырала сферу непасрэднай эканамічнай дзейнасці дзяржавы. У тым жа кірунку дзейнічала і празмернае абмежаванне індывідуальнай працоўнай дзейнасці *[16, с. 195]*. Пры гэтым найбольш значнай для далейшага ўзмацнення камандных метадаў кіравання эканомікай стала распачатая эвалюцыя саўнаргасаўскай сістэмы тэрытарыяльна размеркаванага кіравання эканомікай да традыцыйнага, звыклага для каманднa-адміністрацыйнай сістэмы жорстка цэнтралізаванага галіновага кіравання праз





**У 1958 годзе БССР займала трэцяе месца ў краіне па выпуску грузавых аўтамашын, трактароў, металарэзных станкоў**

галіновыя міністэрствы і міжгаліновыя дзяржаўныя камітэты. Такім чынам, каманднa-адміністрацыйная сістэма ўсё больш тармазіла эканамічнае развіццё краіны.

Пры гэтым самым галоўным было тое, што запаволенне тэмпаў эканамічнага развіцця адчувальна адбілася на сацыяльна-эканамічным становішчы СССР: замарудзіўся рост узроўню жыцця насельніцтва, рэзка павялічыўся таварны дэфіцыт на спажывецкім рынку, узмацнілася інфляцыя. Пагаршалася якасць многіх відаў прадукцыі. Незадаволенасць эканамічным становішчам ахоплівала ўсё большыя пласты насельніцтва, суправаджалася з'яўленнем апазіцыйных палітычных настрояў *[10, с. 185–186]*.

Разам з тым, нягледзячы на запавольванне тэмпаў росту прамысловай вытворчасці, яны заставаліся высокімі. Прамысловасць СССР па ўсё большай колькасці паказчыкаў набліжалася да ўзроўню найболей развітых капіталістычных краін, дасягала і пераўзыходзіла яго. У 1958 годзе Савецкі Саюз адставаў ад ЗША па вытворчасці практычна ўсіх відаў прамысловай прадукцыі, а ў 1964 годзе пры суадносінах аб'ёму вытворчасці савецкай і амерыканскай прамысловасці ўжо больш за 65 % (у тым ліку больш за 50 % на душу насельніцтва) ён абагнаў ЗША па душавой вытворчасці жалезнай руды, металарэзных станкоў, шарсцяных тканін, цукру. У 1962 годзе агульны аб'ём прамысловай вытворчасці СССР складаў 315 % агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці ФРГ, 323 – Англіі, 578 – Японіі. Душавая вытворчасць прамысловай прадукцыі СССР у 1964 годзе склала: у адносінах да ФРГ – 78,8 %, Англіі – 80, Францыі – 122,5, Японіі – 255,7. У БССР у гэтым годзе на душу насельніцтва выраблялася шарсцяных тканін больш, чым у ЗША і ФРГ, бялізнавага трыкатажу і панчошна-шкарпэтачных вырабаў больш, чым у Англіі і Францыі. Беларусь абагнала некаторыя капіталістычныя краіны па душавой вытворчасці і такой прамысловай прадукцыі, як металарэзныя станкі, аўтаматычныя лініі, трактары, калійныя ўдабрэнні, некаторыя віды хімічных валокнаў, скураны абутак *[9, с. 445]*.

Аднак паводле многіх важных паказчыкаў – аб'ёму большасці асноўных відаў прамысловай прадукцыі, яе якасці, прадукцыйнасці працы, навуковага забеспячэння і тэхнічнага аснашчэння вытворчасці, яе тэхналогій і інш. – прамысловасць Беларусі, як і ўсяго СССР, працягвала адставаць ад развітых капіталістычных краін. Калі ў гэтых краінах назіраўся бум выпуску тавараў народнага спажывання – аўтамабіляў, тэлевізараў, моднага адзення, – то для савецкіх людзей усё гэта было маладаступным. Першы беларускі халадзільнік «Мінск-1» быў выпушчаны толькі ў 1962 годзе, а ва ўсім СССР у гэтым годзе халадзільнікі мелі 5,3 % сем'яў, у той час як у ЗША – 98,3 %. Выпуск у БССР новых мадэлей швейных вырабаў катастрафічна адставаў ад запытаў насельніцтва. У 1963 годзе на Віцебскай швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» па новых мадэлях было выпушчана

толькі 9,1 % мужчынскіх і 18,7 % дзіцячых паліто, на Мінскай швейнай фабрыцы імя Н.К. Крупскай – толькі 12 % мужчынскіх кашуль *[20, с. 276; 21; 22, с. 206; 23, арк. 233–234]*. Такая сітуацыя ў немалой меры аказалася следствам пераходу на пераважна тэрытарыяльнае кіраванне прамысловасцю, што негатыўна паўплывала на тэхнічны прагрэс у гэтай вядучай галіне савецкай эканомікі.

На фоне нарастаючага запавольвання росту прамысловай вытворчасці дагнаць і перагнаць вядучыя капіталістычныя краіны, як планаваў М. Хрушчоў, станавілася ўсё больш складанай задачай. Нават пры нарошчванні экстэнсіўных фактараў гэтага росту.

Нягледзячы на тое што ў СССР аб'ёмы капітальных укладанняў у аб'екты вытворчага прызначэння былі намнога большымі, чым у ЗША, эфектыўнасць іх была значна ніжэй. За 1961–1965 гады каэфіцыент аддачы вытворчых капітальных укладанняў у СССР складаў 0,46, тады як у ЗША – 0,66, г. зн. быў на 43 % менш *[12, с. 230–231]*.

Да таго ж у СССР роля прадукцыйнасці працы як аднаго з асноўных фактараў інтэнсіўнага павелічэння аб'ёмаў вытворчасці працягвала зніжацца: за 1961–1965 гады за кошт яе росту было атрымана толькі 62 % прыросту прамысловай вытворчасці, а 38 % – за кошт экстэнсіўных фактараў, у асноўным такога з іх, як павелічэнне колькасці рабочых *[24, с. 129]*.

Калі ў 1953–1958 гады сярэднегадавы рост прадукцыйнасці працы ў савецкай прамысловасці склаў 7,4 %, то ў 1959–1964 гады ён знізіўся да 5,2 %, прычым у апошнія два гады праўлення М. Хрушчова зніжэнне значна паскорылася: у 1962 годзе тэмпы росту прадукцыйнасці працы склалі 5,5 %, у 1963 годзе – 4,8, у 1964-м – 3,7 *[17, с. 44; 18, с. 105]*. Пры гэтым у 1963–1965 гады прадукцыйнасць працы ў савецкай прамысловасці складала толькі каля 45 % ад узроўню прадукцыйнасці працы ў прамысловасці ЗША *[2, с. 18; 25, с. 61]*.

У БССР больш высокія ў 1950-я гады, чым у цэлым па СССР, тэмпы росту прадукцыйнасці працы ў прамысловасці зніжаліся яшчэ хутчэй. У 1951–1955 гады ў сярэднім за год у Беларусі яны складалі 9,9 %, у СССР – 8,3, у 1956–1960 гады – адпаведна 7,4 і 6,5 %, у 1961–1965 гады – 4,6 і 5 % *[14, с. 121; 19, с. 46; 26, с. 45; 27, с. 21]*. Тэмпы росту прадукцыйнасці працы ў прамысловасці рэспублікі ўпалі з 11 % у 1952 годзе да 5 % у 1964 годзе *[7, с. 62–63]*.

Тым не менш высокія тэмпы росту прадукцыйнасці працы, валавой прадукцыі, якія захоўвала прамысловасць Беларускай ССР, дазволілі ёй дасягнуць або перасягнуць узровень прамысловага развіцця шэрагу буйных эканамічных раёнаў Савецкага Саюза. Хаця пры гэтым вытворчасць прамысловай прадукцыі ў рэспубліцы яшчэ адставала ад паказчыкаў найбольш развітых раёнаў і ад сярэдніх паказчыкаў па СССР. У 1964 годзе яна ў разліку на душу насельніцтва раўнялася прыкладна ⅔ сярэднесаюзнага ўзроўню *[28, с. 8–9]*.

Такім чынам, у перыяд з сакавіка 1953 па 1964 год у прамысловым развіцці СССР, у тым ліку Беларусі, вылучаюцца два этапы. На першым этапе, які працягваўся прыкладна да пачатку 1960-х гадоў, былі дасягнуты бясспрэчныя гаспадарчыя поспехі, абагульняючым паказчыкам якіх стаў рост прамысловага патэнцыялу краіны.

Пры гэтым тэмпы росту прамысловасці БССР пастаянна былі на некалькі працэнтаў вышэй за агульнасаюзныя, у выніку чаго рэспубліка станавілася адным з найбольш развітых рэгіёнаў Савецкага Саюза. Яшчэ адна пазітыўная тэндэнцыя – прыкметнае скарачэнне разрыву ва ўзроўнях прамысловага развіцця СССР і найбольш развітых капіталістычных краін. Прыкметнымі ў гэтых адносінах былі і дасягненні прамысловасці БССР. Паспяховаму яе развіццю ў пэўнай меры садзейнічала рэарганізацыя кіравання ёю.

Для другога этапу, які ахапіў 1961–1964 гады, характэрным стала нарастанне негатыўных тэндэнцый – запаволенне тэмпаў росту аб'ёмаў прамысловай прадукцыі, прадукцыйнасці і фондаўзброенасці працы, аддачы асноўных вытворчых фондаў і іншае, што ў рознай ступені праявілася ў БССР і ў цэлым па СССР. Эканамічны эфект рэарганізацыі сістэмы кіравання народнай гаспадаркай аказаўся кароткачасовым. Тым не менш у гэты час прамысловасць БССР, як і ўсяго СССР, працягвала нарошчваць свой патэнцыял і ўсё больш набліжацца да ўзроўню вядучых капіталістычных краін.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.09.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Мировая экономика / В.В. Сущенко [и др.]. – М.: Международные отношения, 1978. – 383 с.
2. Мировая экономика: краткий справочник / подгот. К.А. Баклановой [и др.]. – 2-е изд. пересмотр. и доп. – М.: Экономика, 1965. – 307 с.
3. Развитие социалистической экономики СССР в послевоенный период / Ин-т экономики АН СССР; под ред. И.А. Гладкова. – М.: Наука, 1965. – 600 с.
4. Экономика социалистических стран в цифрах. 1962 год: краткий стат. сб. / Академия наук СССР, Ин-т экономики мировой социалистической системы. – М.: Соцэкгиз, 1963. – 262 с.
5. Народное хозяйство СССР в 1961 г.: стат. ежегодник / Центр. стат. упр. при Совете Министров СССР. – М.: Госстатиздат, 1962. – 861 с.
6. История социалистической экономики СССР: в 7 т. / Акад. наук СССР, Ин-т экономики; редкол.: И.А. Гладков (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1976–1980. – Т. 6: Восстановление народного хозяйства СССР. Создание экономики развитого социализма (1946 – начало 1960-х годов) / Ю.Ф. Воробьев [и др.]. – 1980. – 589 с.
7. Промышленность Белорусской ССР: стат. сб. / Центр. стат. упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Беларусь, 1976. – 477 с.
8. Промышленность Белорусской ССР: стат. сб. / Центр. стат. упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Статистика. Белорус. отд., 1965. – 479 с.
9. Экономика Советской Белоруссии. 1917–1967 / Акад. наук БССР, Ин-т экономики; редкол.: Ф.С. Мартинкевич (отв. ред.) [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1967. – 571 с.
10. Ханин, Г.И. Экономическая история России в новейшее время: монография: в 2 т. / Г.И. Ханин; Новосиб. гос. техн. ун-т. – Новосибирск, Изд-во НГТУ, 2008. – Т. 1. Экономика СССР в конце 30-х годов – 1987 год. – 516 с. – (Серия «Монографии НГТУ»).
11. Экономическая история Беларуси: учеб. пособие для студентов эконом. специальностей вузов / В.И. Голубович [и др.]; под ред. В.И. Голубовича. – Минск: Экоперспектива, 2001. – 400 с.
12. Малышев, П.А. Критерий эффективности социалистического воспроизводства (социально-экономический аспект) / П.А. Малышев, И.Г. Шилин. – М.: Мысль, 1973. – 382 с.
13. Развитие экономики Белоруссии в 1961–1970 гг. / АН БССР, Ин-т экономики; под ред. В.И. Дрица. – Минск: Наука и техника, 1978. – 237 с.
14. Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти / Академия наук БССР, Ин-т экономики; под ред. Ф.С. Мартинкевича. – Минск: Наука и техника, 1970. – 527 с.
15. Глиньский, Б. Теория и практика управления промышленными предприятиями / Б. Глиньский. – М.: Экономика, 1969. – 165 с.
16. Воробьев, Ю.Ф. Очерки экономических реформ / Ю.Ф. Воробьев [и др.]; отв. ред. Ю.Ф. Воробьев. – М.: Наука, 1993. – 271 с.
17. Народное хозяйство СССР в 1977 г.: стат. ежегодник / Центр. стат. упр. СССР. – М.: Статистика, 1978. – 655 с.
18. «Таковы, товарищи, факты» // Источник: Документы русской истории. – 1998. – № 2. – С. 101–125.
19. Статистический ежегодник Белорусской ССР. Народное хозяйство республики в 1972 году / Центр. стат. упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Беларусь, 1973. – 248 с.
20. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: дапаможнік / У.Р. Казлякоў [і інш.]; пад рэд. Л.В. Лойкі. – Мінск: ТАА «ЦІПР», 2003. – 348 с.
21. Жирнов, Е. Жертвы холодильной войны [Электронный ресурс] / Е. Жирнов // Коммерсантъ-Деньги. – Режим доступа: https://www.kommersant.ru/doc/809042. – Дата доступа: 31.08.2022.
22. Министерство экономики Республики Беларусь: история и современность / А.В. Червяков [и др.]; редкол.: В.Г. Гусаков [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2021. – 638 с.
23. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 30. Оп. 9. Д. 373.
24. Лельчук, В.С. Научно-техническая революция и промышленное развитие СССР / В.С. Лельчук; отв. ред. М.П. Ким. – М.: Наука, 1987. – 285 с.
25. Экономика стран социализма и капитализма: цифры и факты: учебное пособие по курсу «Экономика зарубежных стран» / подгот. Б.Я. Гершкович [и др.]; под ред. Б.Я. Гершковича. – М.: Высшая школа, 1978. – 184 с.
26. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1971 году: стат. сб. / Центр. стат. упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Беларусь, 1972. – 222 с.
27. Экономика социалистических стран в цифрах. 1965 год: краткий стат. сб. / Академия наук СССР, Ин-т экономики мировой социалистической системы. – М.: Мысль, 1966. – 237 с.
28. Малинин, С.Н. Народное хозяйство Белоруссии на современном этапе / С.Н. Малинин, М.М. Иппа, А.В. Разуменко. – Минск: Беларусь, 1964. – 156 с.